УДК 821.162.3.09 + 821.581.09

# БЕЛОРУССКАЯ ЛИТЕРАТУРА XI–XXI вв.: СТАНОВЛЕНИЕ И ЭВОЛЮЦИЯ ЖАНРОВ

***Л. Д. СИНЬКОВА***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

***Аннотация.*** Представлены исследования по проблеме движения жанровых форм в отечественной художественной словесности, проведенные учеными кафедры истории белорусской литературы филологического факультета Белорусского государственного университета в 2023 г. Выделены жанровые процессы в текстах старобелорусской ораторской прозы XII–XIII вв., памятниках книжной традиции XVI – начала XVII в., описан жанровый синкретизм в полемических произведениях конца XVI – первой половины XVII в., охарактеризованы инновации в жанровой системе белорусской поэзии и прозы XIX и XX–XXI вв. Очерчены перспективы компаративного и семиотического исследования жанровых канонов и их модификаций в современном отечественном литературоведении.

***Ключевые слова:*** белорусская литература; фольклор; литературные памятники; ораторская проза; полемическая литература; жанровый канон; движение жанров; жанровые модификации; жанровый синкретизм; формат.

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА XI–XXI стст.: СТАНАЎЛЕННЕ І ЭВАЛЮЦЫЯ ЖАНРАЎ

***Л. Д. СІНЬКОВА***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

***Анатацыя.*** Прадстаўлены даследаванні па праблеме руху жанравых форм у айчынным мастацкім пісьменстве, праведзеныя навукоўцамі кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 2023 г. Вылучаны жанравыя працэсы ў тэкстах старабеларускай аратарскай прозы XII–XIII стст., помніках кніжнасці XVI – пачатку XVII ст., апісаны жанравы сінкрэтызм у палемічных творах канца XVI – першай паловы XVII ст., ахарактарызаваны інавацыі ў жанравай сістэме беларускай паэзіі і прозы XIX і XX–XXI стст. Акрэслены перспектывы кампаратыўнага і семіятычнага даследавання жанравых канонаў і іх мадыфікацый у сучасным айчынным літаратуразнаўстве.

***Ключавыя словы:*** беларуская літаратура; фальклор; літаратурныя помнікі; аратарская проза; палемічная літаратура; жанравы канон; жанравы рух; жанравыя мадыфікацыі; жанравы сінкрэтызм; фармат.

**Образец цитирования:**
Сінькова ЛД. Беларуская літаратура XI–XXI стст.: станаўленне і эвалюцыя жанраў. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.* 2024;3:31–36.
EDN: SQSHDY

**For citation:**
Sinkova LD. Belarusian literature of 11th–21st centuries: establishment and evolution of genres. *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2024;3:31–36. Belarusian.
EDN: SQSHDY

**Автор:**
***Людмила Дмитриевна Синькова*** – доктор филологических наук, профессор; заведующий кафедрой истории белорусской литературы филологического факультета.

**Author:**
***Lyudmila D. Sinkova***, doctor of science (philology), full professor; head of the department of history of Belarusian literature, faculty of philology.
*ludmilasinkova@gmail.com*

CC BY NC

# BELARUSIAN LITERATURE OF 11$^{th}$–21$^{st}$ CENTURIES: ESTABLISHMENT AND EVOLUTION OF GENRES

*L. D. SINKOVA*[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnacsi Avenue, Minsk 220030, Belarus*

***Abstract.*** The article describes the research on the problem of the movement of genre forms in domestic artistic writing carried out by scientists of the department of history of Belarusian literature of the faculty of philology of the Belarusian State University in 2023. Genre processes in the texts of Old Belarusian oratorical prose of the 12$^{th}$–13$^{th}$ centuries, literary monuments of the 16$^{th}$ – beginning of the 17$^{th}$ centuries, genre syncretism in polemical works of the end of the 16$^{th}$ – the first half of the 17$^{th}$ centuries are highlighted, innovations in the genre system of Belarusian poetry and prose of the 19$^{th}$ and 20$^{th}$–21$^{st}$ centuries are characterised. The prospects for comparative and semiotic research of genre canons and their modifications in modern domestic literary criticism are outlined.

***Keywords:*** Belarusian literature; folklore; literary monuments; oratorical prose; polemical literature; genre canon; movement of genres; genre modifications; genre syncretism; format.

## Уводзіны

Узаемасувязь статыкі і дынамікі ў любым культуратворчым працэсе застаецца бясспрэчнай. Аднак тэмпы глабальных змен у соцыуме, з якімі сутыкнуўся чалавек на постсавецкай прасторы, стварылі ў яго, між іншым, ілюзію поўнай нестабільнасці самых розных структур рэальнага свету. У літаратуры і літаратуразнаўстве таксама з'явіліся тэндэнцыі да абсалютызацыі плыткасці мастацкіх форм, найперш жанравых. Паколькі жанравыя межы з асаблівай інтэнсіўнасцю размываліся ў эпоху постмадэрнізму, які прынцыпова супрацьстаіць любой цэнтраімклівасці і кананізацыі, у сучаснай Беларусі дастаткова шырока распаўсюдзілася меркаванне пра тое, што катэгорыя жанру канчаткова састарэла.

Аднак практыка сусветнага, у тым ліку беларускага, літаратурнага працэсу пярэчыць згаданай вышэй інвектыве пра архаічнасць катэгорыі жанру хоць бы з той відавочнай прычыны, што без жанравай дамінанты ў літаратуры не можа быць мастацкай цэласнасці (іншымі словамі, якаснага мастацкага тэксту). Тым больш не падлягае бязжанраваму прачытанню літаратурная спадчына, якая датуецца мінулымі эпохамі.

Пытанне жанравых форм у літаратуразнаўстве адносіцца да кола праблем гістарычнай паэтыкі. Звяртаючыся да гэтай тэмы, Ю. М. Лотман яшчэ ў 1970 г. прапанаваў адну з самых канструктыўных семіятычных ідэй: «Дуалізм формы і зместу павінен быць заменены паняццем ідэі, якая рэалізуе сябе ў адэкватнай структуры і не існуе па-за гэтай структурай» (пераклад наш. – *Л. С.*) [1, с. 19]. З лотманаўскай ідэі вынікае, што «…у сапраўды наватарскіх, этапных для мастацкага мыслення творах нам адкрываецца дынаміка жанравай структуры – момант няпэўнасці, нясталасці, нестандартнасці формы; момант унікальнасці, момант якасна новага для свайго часу мастацкага сэнсавага звязу; момант нараджэння новай, дастаткова значнай мастацкай ідэі. У процівагу звычайнаму, таксама прадуктыўнаму і абавязкова-непазбежнаму руху вядомых формаў, які ўвасабляе сабою момант стабільнасці, узбагачае і мацуе жанравую тыпалогію, забяспечвае літаратурны працэс як штодзённую бытнасць літаратуры» [2, с. 5]. Для беларускай мастацкай традыцыі абедзве названыя тэндэнцыі маюць вялікае значэнне: патрабуюцца і адкрыцці адзінкавых мастацкіх структур, якія вонкава разбураюць звыклыя жанры і тым самым ствараюць новыя ўзоры для мультыплікацыі, і ўзнаўленне пісьменнікамі вядомых, нават банальных жанраў (у эпоху масавай культуры найперш формульных жанраў), што забяспечваюць назапашванне аналагічных з'яў, дазваляючы пашыраць ды насычаць актуальнымі феноменамі поле літаратуры і выбудоўваць тыпалагічныя шэрагі ў літаратурным працэсе.

Акрэсленыя праблемныя аспекты ў галіне жаналогіі абумовілі выбар супрацоўнікамі кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта тэмы навуковых даследаванняў «Беларуская літаратура XI–XXI стст.: станаўленне і эвалюцыя жанраў» (№ дзярж. рэгістрацыі 20212928), прадугледжанай для выканання на 2021–2025 гг., з ажыццяўленнем у 2023 г. этапу «Праблема родава-жанравай дыфузіі ў літаратуры Беларусі XI–XXI стст.». Навуковыя распрацоўкі прафесарска-выкладчыцкага калектыву кафедры ў 2023 г. былі скіраваны на вывучэнне жанраўтваральных працэсаў у кардынальна адрозныя перыяды гісторыі беларускай літаратуры. У ходзе працы высветлілася, што выбраныя даследчыцкія падыходы дазваляюць сцвердзіць новыя трактоўкі хрэстаматыйных здабыткаў айчыннай літаратуры XI–XXI стст.

## Вынікі і іх абмеркаванне

Прынцып гістарызму, характэрны для метадалогіі культурна-гістарычнай школы, якую развіваюць літаратуразнаўцы філалагічнага факультэта БДУ, найбольш відавочна выявіўся ў работах спецыялістаў па літаратуры перыяду старажытнасці і эпохі Сярэдневякоўя. У ходзе навукова-даследчай працы па тэме «Беларуская літаратура XI–XXI стст.: станаўленне і эвалюцыя жанраў» да разгляду мастацкіх форм аратарскай прозы ў даўняй беларускай літаратуры XII–XIII стст. звярнулася старшы выкладчык В. П. Крычко. Такі ракурс аналізу паспрыяў актуальнаму асэнсаванню рыс нацыянальнай адметнасці ў літаратурнай эпісталаграфіі. Спецыялістам быў вызначаны сацыяльна-культурны статус старабеларускай прозы названага тыпу. Дзякуючы ўвазе да тэкставага матэрыялу В. П. Крычко ўдакладніла жанравую спецыфіку ўрачыстага красамоўства Кірылы Тураўскага, а таксама сувязь творчасці Францыска Скарыны з усходнеславянскай традыцыяй аратарскай прозы. Развіццё літаратуры ў часы Рэнесансу і барока паслядоўна і глыбока даследуе кандыдат філалагічных навук дацэнт У. Г. Кароткі. Вядомы вучоны ў межах кафедральнай навуковай тэмы распрацаваў кола пытанняў, якія тычацца гістарычных артэфактаў, і акрэсліў свой плён за 2023 г. назвай «“Малая” і “падарожная” кніжкі ў пісьмовай культуры Беларусі XVI–XVII стст.». Вынікам вывучэння У. Г. Кароткім корпусу кірылічных помнікаў дадзенага перыяду стала акрэсленне поля адрасатаў і адрасантаў «малых» і «падарожных» кніжак. Гэтыя параметры адсылаюць да праблемы жанравай эвалюцыі і асобных жанрава-стылістычных мадыфікацый, прыкметных у пісьменстве згаданай эпохі. Адной з вядучых персаналій у даследаванні, безумоўна, з’яўляецца Францыск Скарына. Істотная ўвага была нададзена таксама плёну Міколы Гусоўскага[1]. Абгрунтавана выснова пра тое, што пераадоленне замкнёнасці, абмежаванасці асяроддзя адрасатаў кніжнай прадукцыі абумовілі доступ да друкаванай кнігі даволі шырокаму колу дэмакратычных слаёў насельніцтва, у першую чаргу гараджанам і дробнай шляхце. Фармат «малых» кніжак спрыяў фарміраванню ўласных бібліятэк, а кнігі богаслужэбнага характару задавальнялі патрэбы людзей у набажэнстве без наведвання храмаў. Спецыфічнае развіццё жанрава-стылістычных асаблівасцей твораў палемічнай літаратуры канца XVI – першай паловы XVII ст. прааналізавала кандыдат філалагічных навук дацэнт Л. А. Гедзімін. Даследчыца вылучыла і ахарактарызавала жанравы сінкрэтызм некаторых палемічных твораў адзначанага перыяду, выявіла і сістэматызавала выразныя заканамернасці ў будове такіх тэкстаў.

Трансфармацыі традыцыйных фальклорных жанраў і іх адлюстраванне ў розных пластах беларускай і кітайскай культур, а таксама ў абрадавых практыках сучасных беларусаў і кітайцаў вывучаліся доктарам філалагічных навук прафесарам І. В. Казаковай[2]. Мадыфікаваныя мастацкія формы фальклорнай прыроды на песенным матэрыяле часоў Вялікай Айчыннай вайны з архіваў НАН Беларусі і іншых крыніц аналізаваліся таксама дактарантам кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ, дацэнтам кафедры беларускай і замежнай філалогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Н. А. Шэйбак (Гулак), навуковым кансультантам якой з’яўляецца І. В. Казакова. Даследчыца прадставіла тэкст доктарскай дысертацыі «Беларускі ваенны фальклор XX ст.: эвалюцыя, міфасемантыка, спецыфіка мастацкага дыскурсу», па матэрыялах якой выйшла адпаведная манаграфія[3]. Праца прайшла абмеркаванне на пасяджэнні кафедры гісторыі беларускай літаратуры і літаратуразнаўчым навуковым семінары філалагічнага факультэта БДУ, паступіла ў Вучоны савет па профільнай спецыяльнасці 10.01.09 «Фалькларыстыка».

Беларуская літаратура перыяду XX–XXI стст. дае асабліва шмат магчымасцей для вывучэння эвалюцыі жанравых форм у пісьменстве, прыналежным да розных літаратурных родаў і відаў. Доктар філалагічных навук прафесар А. І. Бельскі, які аналізуе класічную і сучасную беларускую літаратуру, у 2023 г. засяродзіў увагу на праблематыцы «Дыялог праз творчасць: пісьменнік – тэкст – жанр». Ён асэнсаваў спецыфіку трансфармацыі жанру малітвы ў творчасці Якуба Коласа, уплыў экзістэнцыяльнай свядомасці на жанравую сістэму і паэтыку тэкстаў Янкі Купалы, разгледзеў структураўтваральныя біяграфічныя элементы ў мастацкім мысленні і прозе Кузьмы Чорнага, прааналізаваў жанравыя і стылістычныя асаблівасці лірыкі Рыгора Барадуліна, Яўгеніі Янішчыц і інш. Матэрыялы і вынікі даследавання былі адлюстраваны ў часопісе «Роднае слова», зборніках навуковых артыкулаў, электронных публікацыях на сайтах філалагічнага факультэта БДУ «Народныя паэты і пісьменнікі Беларусі» і «Бібліятэка філолага»[4]. Праца па навуковым

[1]*Кароткі У. Г., Некрашэвіч-Кароткая Ж. В.* «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага ў кантэксце хрысціянскай традыцыі эпохі Рэнесансу // Наша вера. 2023. № 2. С. 7–11.

[2]*Казакова І. В.* Жаночая доля ў беларускіх і кітайскіх народных песнях // Род. слова. 2023. № 9. С. 94–96 ; *Яна ж.* Кітайскія легенды і паданні пра каханне // Там жа. 2024. № 3. С. 94–96.

[3]*Гулак Н. А.* Беларускі ваенны фальклор: эвалюцыя, міфасемантыка, паэтыка. Мінск : Рэсп. ін-т выш. шк., 2022. 240 с.

[4]*Бельскі А. І.* «Гэта ўсё адтуль, сапраўднае»: Цімкавічы ў жыцці і творчасці Кузьмы Чорнага // Род. слова. 2023. № 7. С. 32–37 ; *Ён жа.* Литературоведческая культурно-историческая школа // Научные школы БГУ в воспоминаниях и размышлениях профессоров / под ред. С. В. Абламейко, А. И. Зеленкова. Минск : БГУ, 2023. С. 229–232 ; *Ён жа.* Плён маладога натхнення // Маладая плынь : навук. і літ. альм. каф. гісторыі беларус. літ. БДУ. Вып. 2 / рэдкал.: А. І. Бельскі (гал. рэд. і ўклад.) [і інш.]. Мінск : БудМедыяПраект, 2023. С. 3–4 ; *Ён жа.* Янка Купала і Кузьма Чорны // Беларус. мова і літ. 2024. № 1. С. 45–50.

кіраўніцтве гэтымі сайтамі таксама вядзецца А. І. Бельскім. Дактарант кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ, дацэнт кафедры беларускай філалогіі філалагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы А. А. Брусевіч, навуковым кансультантам якога з'яўляецца А. І. Бельскі, прадставіў на абмеркаванне калег тэкст даследавання «Беларуская і польская паэзія другой паловы XIX – пачатку XX ст.: станаўленне і дыялог мастацкіх парадыгм». У гэтым рукапісе, праца над якім працягваецца, істотная роля нададзена праблеме станаўлення жанравых форм у творчасці аўтараў беларуска-польскага геаграфічнага і культурнага памежжа.

Гісторыю і актуальны стан беларускай літаратуры XX–XXI стст. разглядае кандыдат філалагічных навук дацэнт І. І. Шматкова. Яе ўвага ў 2023 г. была звернута на выяўленне ідэйна-тэматычных і жанрава-стылістычных заканамернасцей беларускай жаночай паэзіі XX ст.[5] У публікацыях даследчыцы сістэматызуецца шырокая шматжанравая паэтычная плынь, асобна вылучаецца лірыка аўтараў-жанчын. Вывучаецца тыпалогія жанраў у вершатворчасці і арыгінальных мастацкіх формах драматызаванай лірыкі. Жаночая лірыка пазіцыянуецца менавіта як сістэмна-тыпалагічнае цэлае ў беларускай літаратуры XX ст., адметны складнік агульнага літаратурнага працэсу з улікам спецыфікі гістарычнага часу і яго руху[6]. Кандыдат філалагічных навук дацэнт Г. М. Мятліцкая прааналізавала ідэйна-эстэтычную і жанравую спецыфіку ўзораў беларускай класічнай літаратуры першай паловы XX ст. У выніку даследавання з'явіліся публікацыі, прысвечаныя творчасці Якуба Коласа і Кузьмы Чорнага і звязаныя з вывучэннем жанраў казак жыцця і аповесці, узаемасувязі эпічных жанраў, а таксама творчай дзейнасці загадчыцы кафедры беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ ў 1972–1985 гг., заслужанага работніка вышэйшай школы Беларусі В. В. Казловай, якая вывучала творчасць Якуба Коласа[7].

У навукова-даследчай дзейнасці кандыдата філалагічных навук дацэнта П. І. Навуменкі з 2008 г. значнае месца займалі праекты, якія выконваліся ў межах супрацоўніцтва БДУ і Альдэнбургскага ўніверсітэта імя Карла фон Асецкага. Сумесна з выпускнікамі кафедры, яе аспірантамі і дактарантамі, вялася работа з прафесарам Г.-Б. Колер, дырэктарам Інстытута славістыкі Альдэнбургскага ўніверсітэта імя Карла фон Асецкага, а таксама з іншымі еўрапейскімі калегамі-славістамі. Працягваецца плённае вывучэнне спецыфікі важнейшых сегментаў літаратурнага поля Беларусі першай трэці XX ст. Пры гэтым П. І. Навуменка звярнуў увагу на жанрава-тэматычную разнастайнасць мастацкай творчасці ў названы перыяд. Ажыццяўляецца падрыхтоўка падручніка па гісторыі беларускай літаратуры для еўрапейскіх універсітэтаў, у змест якога ўвойдуць пытанні дынамікі мастацкіх (жанравых) форм беларускага пісьменства. Таксама П. І. Навуменка выступіў укладальнікам і навуковым рэдактарам тома навуковых прац Г.-Б. Колер, які выйшаў у межах універсітэцкай серыі «Замежная беларусістыка», і напісаў прадмову да яго[8].

Праблематыка інавацый у жанравай сістэме беларускай прозы XX–XXI стст. вывучалася доктарам філалагічных навук прафесарам Л. Д. Сіньковай. У яе публікацыях была вызначана карэляцыя паміж традыцыйнымі паняццямі «тэкст», «наратыў», «стыль» («ідыястыль пісьменніка», «функцыянальны стыль», «стыль эпохі») і «дыскурс», а таксама паміж тэрмінамі «жанр» і «фармат»[9]. Гэтыя сэнсавыя ўдакладненні пададзены як уводныя даныя для кампаратыўнага і семіятычнага прачытання мастацкіх, дакументальна-мастацкіх, мастацка-публіцыстычных тэкстаў[10], яны прадстаўлены ў якасці важнага складніка пры вывучэнні дынамікі літаратуразнаўчай катэгорыі жанру ў літаратуры XXI ст. Пад навуковым кіраўніцтвам Л. Д. Сіньковай дактарант кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ, прафесар кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў гуманітарнага факультэта По-

[5]*Шматкова І. І.* Беларуская жаночая паэзія XX стагоддзя : вучэб.-метад. дапам. Мінск : БДУ, 2023. 199 с. ; *Яна ж.* Беларуская жаночая паэзія і літаратурны працэс XX стагоддзя // София. 2023. № 1. С. 41–49 ; *Яна ж.* Белорусская женская поэзия первой половины XX в. в литературном контексте // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе : сб. науч. ст. Вып. 8 / под ред. В. И. Дуная. Пинск : ПолесГУ, 2023. С. 112–115.

[6]*Шматкова И. И.* Гинокритика и женская поэзия в белорусской литературе XX века // Наука как ключевой фактор развития современного общества : материалы I Междунар. науч.-практ. конф. (Краснодар, 29 марта 2024 г.). Краснодар : ИП Алзидан Махер, 2024. С. 622–629 ; *Она же.* «Женская поэзия» в белорусской литературе: становление термина // София. 2023. № 2. С. 49–56 ; *Она же.* Сучасная беларуская жаночая навела: высокая проза альбо любоўнае чытво? // Род. слова. 2024. № 3. С. 11–16.

[7]*Мятліцкая Г. М.* Натурфіласофская стыхія агню ў «Казках жыцця» Якуба Коласа // Род. слова. 2023. № 11. С. 12–15 ; *Яна ж.* Рупная працаўніца на філалагічнай ніве (Вольга Васільеўна Казлова) // София. 2024. № 1. С. 81–86.

[8]*Навуменка П. І.* Некалькі слоў пра аўтара і кнігу: прадмова // Выбраныя працы па беларускім літаратуразнаўстве / Г.-Б. Колер ; склад. П. І. Навуменка ; пад рэд. П. І. Навуменкі. Мінск : БДУ, 2021. С. 3–10.

[9]*Сінькова Л. Д.* Наратыў, фармат, дыскурс у сучаснай мастацкай публіцыстыцы // Полымя. 2023. № 7. С. 90–100 ; *Яна ж.* Паленіка 2000-х – 2010-х гг. пра паэму Якуба Коласа «Новая зямля» // Род. слова. 2022. № 12. С. 17–19 ; *Яна ж.* Стыль эпохі і мастацкі дыскурс у тэкстах Янкі Купалы 1910–1920-х гадоў // Там жа. 2023. № 1. С. 7–9.

[10]*Сінькова Л. Д.* Карэляцыя як метад у параўнальным вывучэнні літаратур // Acta Albaruthenica. 2014. № 14. С. 347–356 ; *Яна ж.* Метадалогія кампаратывістыкі // Białorutenistyka Białost. 2016. № 8. С. 501–508 ; *Яна ж.* Прафесія – журналіст, пакліканне – мастак: жанравая дынаміка на памежжы журналістыкі і мастацкай прозы пра вайну // Журн. Белорус. гос. ун-та. Журналистика. Педагогика. 2020. № 2. С. 13–18.

лацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай З. І. Траццяк паспяхова абараніла доктарскую дысертацыю «Беларуская і амерыканская проза пра Першую сусветную вайну: структурныя ўзроўні і дамінантныя матывы» (Мінск, 2022). У гэтай працы, як і ў дзвюх манаграфіях па яе матэрыялах[11], праблемы тыпалагічнага і карэлятыўнага параўнальна-супастаўляльнага вывучэння нацыянальных літаратурных традыцый, што з'яўляюцца максімальна аддаленымі ў геаграфічным, а таксама ў гісторыка-культурным плане, атрымалі прынцыпова новае ды цалкам карэктнае вырашэнне. Інавацыйнасць або формульнасць жанру кожнага твора патрабавала вызначэння ўжо на самым пачатку кампаратыўнага разгляду тэкставых матэрыялаў, і гэта патрабаванне было паслядоўна выканана ў работах З. І. Траццяк, эмпірычнай базай якіх выступіла арыгінальная англамоўная і беларускамоўная мастацкая літаратура. Пад кіраўніцтвам Л. Д. Сіньковай у рэчышчы згаданай вышэй навуковай тэмы на этапе 2023 г. плённа прааналізаваны рух жанравых структур іншымі дактарантамі кафедры. Так, дацэнт Л. В. Алейнік ажыццявіла даследаванне на тэму адлюстравання ў жанрах сучаснага беларускага апавядання, аповесці і рамана працэсаў сацыялізацыі сучаснай моладзі[12], дацэнт В. М. Губская, загадчык кафедры беларускай і рускай моў факультэта міжнародных бізнэс-камунікацый Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, – на тэму жанрава-відавой дыферэнцыяцыі беларускай класічнай прозы дакументальна-мастацкага характару[13], а таксама літаратуры XXI ст. у сувязі з лічбавым інструментарыем[14], А. П. Чарнякевіч-Бязлепкіна, дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі БДУ, – на тэму пазіцыянавання жанрава-відавога руху мастацкіх форм у літаратурным працэсе Беларусі на розных этапах яго гістарычнага развіцця ў XIX–XXI стст.[15]

Не менш актыўная даследчыцкая дзейнасць у акрэсленым праблемна-тэматычным коле вядзецца адоранымі студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі ў тандэме з вопытнымі навукоўцамі кафедры. Так, значныя публікацыі ў 2023 г. падрыхтавалі, напрыклад, выхаванцы А. І. Бельскага (выпускніца аспірантуры Т. А. Лаўрык[16]), П. І. Навуменкі (магістрантка Э. А. Мурзіч[17]), Л. А. Гедзімін (студэнт Г. А. Леонцьеў[18]), Л. Д. Сіньковай (аспіранты К. А. Крыцук-Тарасава[19], К. Д. Мажэйка[20], Д. А. Юркойць[21]) і інш.

## Заключэнне

Сучаснае беларускае літаратуразнаўства – гэта навуковая прастора, дзе ў складаным кантрапункце, у разгалінаваных узаемасувязях суіснуюць акадэмічныя традыцыі БССР (СССР) і мегатэндэнцыі, што прыйшлі ў сусветную навуку разам з эпохай глабальнай вёскі (М. Маклюэн): развіццём неахопнага інтэрнэту, экспансіяй штучнага інтэлекту, самымі разнастайнымі крыніцамі новай інфармацыі. Аднак з гэтымі знакамі цывілізацыйнага памкнення чалавецтва наперад сутыкаліся людзі заўсёды, і спрадвечная задача па захаванню аўтэнтычных культур застаецца нязменнай для ўсіх народаў. Навуковая культура не з'яўляецца выключэннем. Тое, што шэраг базавых тэрмінаў з літаратуразнаўчай галіны патрабуюць пераасэнсавання

[11] *Траццяк З. І.* Беларуская і амерыканская проза пра Першую сусветную вайну: узроўні параўнальнага вывучэння. Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т імя Еўфрасінні Полацкай, 2021. 319 с. ; *Яна ж.* Беларуская і амерыканская літаратура пра Першую сусветную вайну: вопыт карэлятыўнага даследавання. Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т імя Еўфрасінні Полацкай, 2024. 256 с.

[12] *Алейнік Л. В.* Сучасная беларуская проза для дзяцей і юнацтва ў функцыянальным аспекце : манаграфія. Мінск : БДУ, 2024. 215 с.

[13] *Губская В. М.* Даследаванне літаратуры з дамінантным дакументальным пачаткам у беларускім літаратуразнаўстве: развіццё традыцыі // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Філалогія. 2023. № 2. С. 30–37.

[14] *Губская В. М.* Художественный текст в цифровом пространстве: новые возможности существования // Медиа в современном мире. 62-е Петербургские чтения : сб. материалов ежегод. 62-го Междунар. науч. форума (Санкт-Петербург, 28 июня – 1 июля 2023 г.) : в 2 т. Т. 1 / под ред. А. А. Малышева. СПб. : Медиапапир, 2023. С. 142–144.

[15] *Бязлепкіна А. П.* Беларуская літаратура мяжы XX–XXI стст.: тэндэнцыі развіцця // Stud. Białorutenistyczne. 2013. № 7. С. 149–163 ; *Безлепкина-Чернякевич О. П.* Эволюция понятия «тутэйшасць» в белорусской литературе конца XIX – начала XXI в. // Миргород. 2021. № 18. С. 18–44.

[16] *Лаўрык Т. А.* Гістарычная проза Леаніда Дайнекі: актуальныя аспекты вывучэння // Беларус. мова і літ. 2022. № 3. С. 33–40.

[17] *Мурзіч Э. А.* Белетрыстычныя элементы ў малой прозе М. Зарэцкага (навелы «Бель», «На чыгунцы» і «Кветка пажоўклая») // Мова і літаратура : матэрыялы 79-й навук. канф. студэнтаў і аспірантаў філал. фак. БДУ (Мінск, 11 мая 2022 г.) / пад рэд. Г. У. Навумавай (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2022. С. 150–153.

[18] *Леонцьеў Г. А.* Уладзіслаў Сыракомля ва ўспрыманні беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі 1903–1917 гадоў // Мова і літаратура ў XXI стагоддзі: актуальныя аспекты даследавання : матэрыялы VII Рэсп. навук.-практ. канф. маладых вучоных (Мінск, 3 сак. 2023 г.) / рэдкал.: В. У. Зуева (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2023. С. 345–348.

[19] *Крыцук-Тарасава К. А.* Прыжыццёвы вобраз-імідж Янкі Купалы ў перыядычным друку БССР 1920–1930-х гг. // Мова – літаратура – культура : матэрыялы X Міжнар. навук. канф., прысвеч. 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа (Мінск, 29–30 верас. 2022 г.) / рэдкал.: А. І. Бельскі (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2022. С. 114–121.

[20] *Можейко Е. Д.* Понятия аллюзии и цитаты в контексте интертекстуальных включений // На перекрестке культур: единство языка, литературы и образования – III : сб. науч. ст. по материалам III Междунар. науч.-практ. интернет-конф. (Могилёв, 12–16 дек. 2022 г.) / под ред. А. К. Шевцовой. Могилёв : МГУ им. А. А. Кулешова, 2023. С. 240–242.

[21] *Юркойць Д. А.* Вобраз будучыні праз бінарныя апазіцыі ў «масавай паэзіі» Заходняй Беларусі // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. A, Гуманит. науки. 2024. № 2. С. 37–42.

і абноўленага ўжывання, толькі спрыяе інтэнсіўнаму развіццю славістычных даследаванняў. Супрацоўнікі кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ таксама пацвердзілі гэта, адэкватна карыстаючыся выверанай метадалагічнай базай. Яны развіваюць кампаратыўны і семіятычны навуковы пошук, працягваюць істотна ўзбагачаць здабыткі культурна-гістарычнай літаратуразнаўчай школы, заснавальнікам якой быў І. І. Замоцін, акадэмік АН БССР, член-карэспандэнт АН СССР, загадчык кафедры беларускай літаратуры і этналогіі, адкрытай у БДУ ў далёкім ужо 1922 г.

Праведзеныя калектывам кафедры гісторыі беларускай літаратуры даследаванні па тэме «Беларуская літаратура XI–XXI стст.: станаўленне і эвалюцыя жанраў» у 2023 г. дазволілі аргументавана звязаць жанр прытчы з паэтыкай дыдактычнага красамоўства ў літаратуры старажытнай Беларусі, паглыбіць жанравую спецыфіку кірылічных старадрукаў Беларусі XVI–XVII стст. і лацінамоўнай паэзіі гэтага гістарычнага перыяду, выявіць сінкрэтызм жанравай сістэмы беларускай літаратуры XIX ст., вылучыць праблемы новых трактовак жанраў на матэрыяле творчасці класічных аўтараў XX ст., апісаць і ацаніць жанрава-стылістычную разнастайнасць беларускай жаночай паэзіі XX ст., ахарактарызаваць заканамернасці жанрава-тэматычнага развіцця беларускай літаратуры пачатку XX ст., вызначыць жанравы аспект развіцця беларускай прозы 1920–30-х гг., раскрыць і прааналізаваць станаўленне і дынаміку жанраў у беларускай прозе XX–XXI стст., выявіць жанравы аспект у традыцыйных культурах розных народаў і пазіцыянаваць беларускі фальклор у сусветным кантэксце. Значная ўвага пры гэтым надавалася камунікатыўнаму падыходу да асэнсавання жанравых працэсаў (дыскурсіўнасці, інтэрмедыяльнасці, новаму функцыянальнаму патэнцыялу літаратурных тэкстаў з кананічнымі і спецыфічнымі жанравымі формамі), выяўленню агульных заканамернасцей і тэндэнцый станаўлення (эвалюцыі) таго ці іншага літаратурнага жанру ў кампаратыўным аспекце.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Лотман ЮМ. *Структура художественного текста*. Москва: Искусство; 1970. 384 с.
2. Корань ЛД. *Цукровы пеўнік.* Мінск: Мастацкая літаратура; 1996. Дынаміка жанравых структур у беларускай прозе XX ст.; с. 3–70.

## References

1. Lotman YuM. *Struktura khudozhestvennogo teksta* [The structure of the artistic text]. Moscow: Iskusstvo; 1970. 384 p. Russian.
2. Koran' LD. *Cukrovy pewnik* [Sugar cockerel]. Minsk: Mastackaja litaratura; 1996. [Dynamics of genre structures in Belarusian prose of the 20th century]; p. 3–70. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 07.06.2024.*
*Received by editorial board 07.06.2024.*